# УНІЯ Ў ЛІДЗЕ

**Аляксей АСТРОЎСКІ**

**Пабачыла свет кніга аб грэка-каталіцкай царкве.**

У абласной навуковай бібліятэцы імя Я. Карскага адбылася прэзентацыя кнігі краязнаўцы Лявона Лаўрэша «Грэка-каталіцкая (уніяцкая) Царква на Лідчыне». Гэта першае ў Беларусі выданне, што прысвечана жыццю асобнай грэка-каталіцкай парафіі. Большая частка кнігі знаёміць з гісторыяй ўніяцкай царквы на Лідчыне XVI–XIX ст., ідзе гаворка аб архітэктурна-гістарычных асаблівасцях сакральных пабудоў. Узгадаў даследчык і аб лідскім шляху рэфарматара і скасавальніка уніяцкай царквы мітрапаліта Іосіфа Сямашкі. Напрыканцы краязнавец расказвае аб адраджэнні ў 1994 годзе грэка-каталіцкай царквы ў Лідзе і яе стане на сучасным этапе. Парафія налічвае каля 100 прыхаджан.